# БРЫЛЁЎСКІ летапіс

"Куды б усе мы забрылі,
Калі б не вёсачка Брылі ?.."

№ 5 (147)
сакавік
2011 г.

ІНФАРМАЦЫЙНА - ГРАМАДСКІ БЮЛЕТЭНЬ

Выдаецца з мая 2006 г.


Вясна заўсёды перамагае зіму. Негледзячы ні на якія зімовыя прыдумкі. Таму, што гэта закон прыроды, а супраць *такіх* законаў, як кажуць, не папрэш. І вось ужо ласкавае сонейка ўздымаецца вышэй і вышэй, і ўсё адчувальнее подых надыхода нечага новага. І мудры кот з зылеўскага падворку Валянціны Елісееўны Куляшовай, нетаропка ідучы па плоце, думае над тым, што ёсць нешта такое ў гэтай назве - *“сакавіцкі кот”*…

**Віншуем!**
**Вясна прыйшла!**
**Усё толькі пачынаецца!**






Свята
с.3

# Віншуем з Юбілеем!



3 сакавіка
Яўгенія Браніславаўна
НЯДВЕЦКАЯ
адзначае 85-годдзе

28 сакавіка
Валянціна
Аляксееўна
ЛАЧКОЎСКАЯ
адзначае
65-годдзе

24 сакавіка
Мікалай
Генадзьевіч
СМАЛЯКОЎ
адзначае
30-годдзе



20 сакавіка
Віктар
Міхайлавіч
НОВІКАЎ
адзначае
55-годдзе

5 сакавіка
Людміла
Андрэеўна
ПАРФЕНЕНКА
адзначае
55-годдзе





11 сакавіка
Ганна
Уладзіміраўна
ШЫБАКОВА
адзначае
20-годдзе

## З Днём нараджэння!

Ягор Міхайлавіч Смалякоў - 1
Генадзь Пятровіч Пятроў - 1
Ганна Фёдараўна Васюрэнка - 5
Святлана Дзянісаўна Пятрова - 8
Станіслаў Андрэевіч Васюрэнка - 8
Андрэй Паўлавіч Падалякін - 9
Васіль Пятровіч Мажаеў - 10
Наталля Віктараўна Масіеўская - 11
Людміла Уладзіміраўна Сідарава - 11

12 - Юлія Сяргееўна Ермалаева
14 - Рыгор Уладзіміравіч Інчанка
15 - Кацярына Васільеўна Іванцію
15 - Любоў Якаўлеўна Пухаленка
22 - Віталь Генадзьевіч Пшанічны
24 - Галіна Фёдараўна Жукава
24 - Андрэй Юр'евіч Пруднікаў
28 - Валянціна Васільеўна Ляутка
29 - Андрэй Алегавіч Сідзельнікаў





29 сакавіка сваё 22-годдзе адзначае
Алена Святаславаўна ПАРШНЁВА .
Мама Раіса Генадзьеўна, брат Аляксей,
сёстры Святлана і Карына дасылаюць свае
віншаванні ў далёкі Ізраіль і жадаюць Алене
здароўя, шчасця, поспехаў і ўсяго найлепшага!



# Жаночае свята

7 сакавіка 2011 года ў Брылёўскім сельскім Доме культуры адбыўся традыцыйны канцэрт, прысвечаны міжнароднаму жаночаму дню. Самадзейныя артысты прысвяцілі выступленні сваім дарагім матулям і бабулям, уклаўшы ў кожную песню і ў кожны танец сардэчную цеплыню. Не абышлося і без прэм’еры - Мікола Яцкоў выканаў сваю новую песню “Одноклассница” на верш вядомага віцебскага паэта Кастуся Севярынца, якая была прыязна сустрэта глядзельнай залай.

*Аліна САВІЦКАЯ.*



Марыя Шыманоўская: спявае...







... танцуе “Усходні танец”...



Спявае Ганна Гулакова

Глядзельная зала і танец у выкананні Надзеі Журавай, Ганны Гулаковай і Яны Пшанічнай



Верш чытае Дар’я Старс





Песня ў выкананні Алы і Міколы Яцковых



Ганна Гулакова і Марыя Шыманоўская

# "Мы прыйшлі у бібліятэку!"

Выхавацелі Брылёўскага дзіцячага сада добра ведаюць, што кніга займае ў жыцці чалавека вельмі шаноўнае месца. Таму яны і імкнуцца прышчэпліваць сваім выхаванцам вялікую павагу да друкаванага слова. З гэтай нагоды ладзяцца шчыльныя стасункі паміж садам і Брылёўскай сельскай бібліятэкай, і наведванне дзеткамі гэтай культурна-асветнай установы зрабілася ў Брылях добрай традыцыяй.

16 красавіка 2011 года бібліятэка сустракала шматгалосы дзіцячы "дэсант". Юныя наведвальнікі з цікавасцю агледзелі кніжныя сцелажы і з вялікім задавальненнем пагарталі старонкі кніг і часопісаў. І ёсць спадзяванне на тое, што за дзіцячыя сэрцы нешта зачэпіцца - і з'явіцца жаданне спазнаваць свет праз мудрасць і дакладнасць кніг, у якіх знаходзяца адказы на ўсе складаныя пытанні нашага жыцця.

*Юлія ЯЦКОВА,*
*бібліятэкар Брылёўскай сельскай бібліятэкі.*
**Фотаздымкі М.Яцкова.**


Вось яна якая - бібліятэка!..


Амаль 10.000 кніг месціцца на гэтых стэлажах...


Ю.М.Яцкова і выхавацельніца Т.М.Васюрэнка расказваюць пра кнігі


Памочнік выхавацеля Л.П.Карнеева (справа) таксама ўважліва слухае


А гэта рабочае месца бібліятэкара


Уладзімір Сідараў і Аліна Куляшова



Мікіта Вараб’ёў



Андрэй Падалякін і Андрэй Жукаў



Настасся Дубавая і Кірыл Палтаўцаў





Фотаздымак на ўспамін

# Земля и воля



*Гусиное перо, которым Александр II подписал журнал заседания Общего собрания Государственного Совета об отмене крепостного права в России*

***3 марта 2011 года исполняется 150 лет со дня отмены крепостного права в России.***

3 марта 1861 г. Александр II подписал Манифест *"О всемилостивейшем даровании крепостным людям прав состояния свободных сельских обывателей"* и Положения о крестьянах, выходящих из крепостной зависимости.

Ещё в начале 1857 г. для подготовки крестьянской реформы был учрежден Секретный комитет, который затем был переименован в Главный комитет. В сентябре 1860 г. выработанный проект реформы был обсуждён депутатами, присланными дворянскими комитетами, а затем передан в высшие государственные органы.

В середине февраля 1861 г. Положение об освобождении крестьян было рассмотрено и одобрено Государственным советом. 3 марта (19 февраля по старому стилю) 1861 г. Александр II подписал Манифест . Документ был объявлен в обеих столицах в большой религиозный праздник – Прощёное воскресенье, в других городах – в ближайшую к нему неделю.

Согласно Манифесту, крестьянам были присвоены гражданские права – свобода вступления в брак, самостоятельное заключение договоров и ведение судебных дел, приобретение недвижимого имущества на своё имя и др.

Крестьянству даровалась юридическая свобода, но земля объявлялась помещичьей собственностью. За отводимые наделы крестьяне на положении "временнообязанных" несли в пользу помещиков повинности, которые практически не отличались от прежних, крепостных.

В целом по стране крестьяне были не только ущемлены в размерах земли; они, как правило, получали неудобные для обработки наделы, поскольку самая лучшая земля оставалась у помещиков.



*Объявление Манифеста в одной из барских усадеб*

Следующим этапом освобождения крестьян был переход их в состояние собственников. Для этого крестьянин должен был выкупить землю. Цена выкупа значительно превышала действительную стоимость земли.

Восторженность, с которой был встречен выход Манифеста, вскоре сменилась разочарованием. Бывшие крепостные ожидали полной воли и были недовольны переходным состоянием «временнообязанных». Полагая, что от них скрывают истинное значение реформы, крестьяне бунтовали, требуя освобождения с землёй. Для подавления наиболее крупных выступлений, сопровождавшихся захватом власти, были использованы войска. Всего было зафиксировано более двух тысяч выступлений. Однако к лету 1861 г. волнения пошли на убыль.

Крестьянская реформа 1861 г. открыла перед Россией новые перспективы, создав возможность для широкого развития рыночных отношений. Отмена крепостного права проложила дорогу другим важнейшим преобразованиям, направленным на создание в России гражданского общества.

За эту реформу Александра II стали называть царем Освободителем.

*(По материалам Росархива)*









Памятная медаль в честь 50-летней годовщины отмены крепостного права. 1911 г. *Из коллекции Н.Яцкова*



# БРЫЛЁЎСКАЯ БІБЛІЯТЭКА ІНФАРМУЕ



## Моя любимая дача

№ 2, 2011 г.



### ТАЛИСМАН ЗДОРОВЬЯ

Примерно одиннадцать веков назад привезли этот *“зело лакомый плод”* на Русь греческие купцы. С тех пор укрепилось за ними название *“грецкий”*, или *“греческий”* орех.

Считается, что грецкий орех – лучший талисман долголетия. И такое представление о нём вполне справедливо. Приглядитесь к форме очищенного ореха, и вы увидите, что он напоминает форму мозга человека. Это, конечно, можно считать случайностью, игрой природы, но грецкие орехи действительно восстанавливают силы мозга.

По своей калорийности грецкие орехи превосходят жирную свинину в 1,5 раза, мёд – в 2,5 раза, рыбу – в 7–8 раз, молоко и картофель – в 10 раз.

В недозрелых грецких орехах витамина С в 40-50 раз больше, чем в лимонах.

Их ядра содержат масла, богатые ненасыщенными жирными кислотами, оказывающими благоприятное воздействие при атеросклерозе и проблемах в работе кишечника.

Они снимают умственное и физическое переутомление, помогают выздоравливающим после тяжелых болезней и операций.

**Цитата**

Если ты покупаешь то, что тебе не нужно, то скоро будешь продавать то, что тебе необходимо.

*Бенджамин Франклин, американский деятель.*

### ДЕСЯТЬ ИНТЕРЕСНЫХ ФАКТОВ О ЧЕЛОВЕКЕ

1. В теле человека насчитывается 100-160 миллиардов капилляров. Если бы можно было вытянуть их в одну линию, то ее длина составила бы 60-80 тысяч километров, это в два раза больше длины земного экватора.
2. Крупные артерии человека могут выдерживать давление в 20 атмосфер.
3. По твердости зубную эмаль можно сравнить с кварцем. Известно, что даже острие сабли при ударе об эмаль тупится.
4. На 1 квадратный сантиметр слизистой человеческого желудка приходится 100 желудочных желез. Они расположены вплотную.
5. Подсчитано, что человек за всю жизнь потребляет 2,5 т белка, 1,3 т жира, 17,5 т углеводов и 75 т воды.
6. В теле человека до 3 кг минеральных солей, из которых 5/6 входит в состав скелета. Поваренной соли в организме взрослого человека около 300 граммов.
7. За сутки человек выделяет столько тепла, что его хватит, чтобы довести до кипения 33 литра ледяной воды.
8. Человек более 20 лет из 60 проводит во сне.
9. На 1 квадратном сантиметре кожи находится 100 болевых точек, а всего их на поверхности около миллиона.
10. Полное обращение крови взрослого человека совершается за 20-28 секунд, у ребенка – за 15 секунд, у подростка – за 18 секунд. За сутки кровь вращается по телу 1,5-2 тысячи раз.




Согласно переписи, прошедшей в октябре 2009 года, в десятку наиболее многочисленных национальностей, проживающих в Беларуси, попали: белорусы – 83,7% русские – 8,3% поляки – 3,1% украинцы – 1,7% евреи – 0,1% армяне – 0,1% татары – 0,1% цыгане – 0,1% азербайджанцы – 0,1% литовцы – 0,1%

По сравнению с предыдущей переписью, состоявшейся в 1999 году, доля белорусов в общем составе населения страны выросла на 2,5%. Но в буквальном исчислении белорусов стало меньше на 200 тысяч человек. Теперь к коренной национальности себя относят 7.957.252 жителей Беларуси против 8.159.073 в 1999-м.

За десять лет доля русских в населении Беларуси сократилась на 3%, а в буквальном исчислении их стало меньше на 356 тысяч человек – считай на треть. Евреев в Беларуси стало меньше в 2,2 раза, украинцев – на треть, цыган – на 29%.

Зато численность китайцев, постоянно проживающих на территории нашей страны, выросла более чем в 20 раз, арабов – в 2,7 раза, туркмен – в 2,3 раза.

*Старонку падрыхтавала бібліятэкар Брылёўскай сельскай бібліятэкі Юлія ЯЦКОВА*

Прозвішча падпісчыка

# Пайсці, каб застацца...




**Вадзім Генадзьевіч АРШЫНСКІ**
**( 26.01.1960 - 18.02.2010 )**

18 лютага 2010 года беларускія інфармацыйныя агенцтвы паведамілі: *“У выніку няшчаснага выпадку ў Магілёве загінуў 50-гадовы тэлеаператар Вадзім Аршынскі. Калі ён уваходзіў у дом, дзе жыве, на яго абваліўся казырок што над пад’ездам. У гэтым доме робіцца рамонт даху і казырок абваліўся ад цяжару бураўнічага друзу і снежнай наледзі”.*

І зрабілася вельмі горка ад гэтай навіны, бо нашы Брылі былі радавым вытокам Вадзіма Аршынскага ад дзеда Ігната Ермалаевіча Мяшкова і бабулі Варвары Канстанцінаўны Жылінскай. Тут яму вельмі лёгка дыхалася і тут ён заўсёды прыязна сустракаўся з радней. Вадзім марыў зрабіць фільм пра свае брылёўскія вытокі, але, на вялікі жаль, тое не здзейснілася...

І ў гэтыя чорныя імгненні ў мяне нарадзіліся радкі, якія заплаліся ў вянок памяці:

*Лёс заўсёды раптоўны, цяжкі,*
*І не ведаеш як гэта будзе:*
*Мо гранітнай плітой казыркі*
*Пакладуцца цяжарам на грудзі –*
*І не будзе дыхання зусім*
*Пад тугім, зледзянелым сумётам...*
*І размову з сусветам сваім*
*Не адсунеш на заўтра, на потым.*

Але жыццё не спыняецца - у Вадзіма растуць сыны Міхаіл і Мацвей. А гэта значыць, што брылёўскі радавод будзе гаманіць сваёй вечназялёнай кронай.

Бывай, Вадзім Генадзьевіч!..

*З павагай, Мікола ЯЦКОЎ.*

23/02/2010

“БРЫЛЁЎСКІ ЛЕТАПІС”
Инфармацыйна-грамадскі бюлетэнь в.Брылі Магілёўскага раёна Магілёўскай вобласці, Рэспубліка Беларусь. Заснавальнік - М.А.Яцкоў

Адказны за выпуск - Мікалай Адамавіч ЯЦКОЎ
Адрас: 213107 Магілёўскі раён, в.Брылі, вул. Юбілейная 6 - 7
тэл. маб. +375293732886
e-mail: bryli@mail.ru

Матэрыялы друкуюцца на мове аўтараў. Звярстана і надрукавана на ўласным абсталяванні. Падрыхтавана да друку 20.02.2010. 21.00. Наклад 99 асобнікаў. Распаўсюджваецца бясплатна.

*Старонка “Брылёўскага летапісу” № 4, 2010 г. з некралогам В.Аршынскаму*

**18** лютага 2011 г. споўніўся год, як раптоўна пайшоў з жыцця Вадзім Генадзьевіч Аршынскі -- вядомы беларускі кінадакументаліст, радаводныя вытокі якога ідуць з нашых Брылёў. З нагоды гадавіны ў Магілёўскім абласным краязнаўчым музеі была арганізавана фотавыстава з работ В.Аршынскага. На адкрыцці прысутнічалі прадстаўнікі творчай і навуковай інтэлігенцыі Магілёва. Са зваротам ад імя ўсіх землякоў-брылёўцаў выступіў Мікола Яцкоў і перадаў у сям’ю Аршынскага матэрыялы, якія тычацца яго брылёўскай генеалогіі, і спецыяльны выпуск “Брылёўскага летапісу”, прысвечаны нашаму знакамітаму земляку.

*А.С.*



*На адкрыцці фотавыставы ў краязнаўчым музеі (злева направа): навуковы супрацоўнік музея, удава В.Аршынскага Марына Тарасава, галоўны рэдактар газеты “Веснік Магілёва” Васіль Навічонак, былы старшыня Магілёўскай абласной тэлерадыёкампаніі, кіраўнік абласнога аддзялення Беларускай асацыяцыі журналістаў Генадзь Суднік, прадстаўнікі з Брылёў Мікалай Яцкоў і Ала Яцкова, ад краю справа -- былы кандыдат у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь Рыгор Кастусёў.*

Фотаздымак Ганны Ільіной.

**М**іністэрства фінансаў Беларусі выступіла з прапановай скараціць колькасць занятых у бюджэтнай сферы на 10-15%. Пра гэта 9 лютага заявіў міністр фінансаў Андрэй Харкавец. Паводле яго ацэнак, прывядзенне колькасьці занятых у бюджэтнай сферы ў адпаведнасьць з рэальнымі патрэбамі эканомікі дазволіць скараціць расходы бюджэту на 2 трыльёны рублёў.

Кіраўнікі афіцыйных галіновых прафсаюзаў паведамленнем пра такое істотнае скарачэньне былі агаломшаныя. Старшыня рэспубліканскага прафсаюзу работнікаў адукацыі і навукі Аляксандар Бойка выказаўся так: *«Я ня ведаю, каго ён мае на ўвазе. Настаўніка ж не скароціш, калі дзеці ёсьць. Можа, ён мае на ўвазе чыноўны люд?..”* Старшыня Цэнтральнага прафсаюзу работнікаў культуры Наталля Аўдзеева: *«15% — так ужо „загнулі“, што далей няма куды загібаць… Мы, канечне ж, занепакоеныя. У людзей кантракты. Але звольніць чалавека проста так — складана. Павінны даваць выходныя дапамогі, прадастаўляць працоўныя месцы, Цэнтр занятасці павінен трымаць на ўліку, і стаж павінен ісці. Не будзе ў нас масавага скарачэння. Людзі нашы цярпець не будуць. Народ у нас цярплівы, цямлівы, але ж да пары да часу…»*

(Паводле svaboda.org 10.02.2011 г.)

kamunikat
Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка

*Усе нумары «Брылёўскага летапісу» можна знайсці на старонках Беларускай Інтэрнэт - бібліятэкі “Камунікат”*
**http://kamunikat.org/bryleuski_letapis.html**

“БРЫЛЁЎСКІ ЛЕТАПІС”
Инфармацыйна-грамадскі бюлетэнь в.Брылі Магілёўскага раёна Магілёўскай вобласці, Рэспубліка Беларусь. Заснавальнік - М.А.Яцкоў

Адказны за выпуск - Мікалай Адамавіч ЯЦКОЎ
Адрас: 213107 Магілёўскі раён, в.Брылі, вул. Юбілейная 6 - 7
тэл. маб. +375293732886
e-mail: bryli@mail.ru

Матэрыялы друкуюцца на мове аўтараў. Звярстана і надрукавана на ўласным абсталяванні. Падрыхтавана да друку 15.03.2011. 21.00. Наклад 100 асобнікаў. Распаўсюджваецца бясплатна.

*У афармленні лагатыпу назвы выдання выкарыстан верш Міколы Шабовіча*